каштоўнасных арыенціраў, які актыўна ўплывае на фарміраванне грамадскай думкі. У сувязі з гэтым хочацца нагадаць, што любая дэфармацыя рэчаіснасці ў працэсе інтэрпрэтацыі здольная змяняць нацыянальную лагасферу, уплываючы на свядомасць і маральна-этычныя прынцыпы беларусаў, што, у сваю чаргу, патэнцыяльна можа паўплываць на рэальнае пераўтварэнне сацыяльнай рэчаіснасці.

*Літаратура*

1. Богуславская, В. В. Моделирование текста: лингвосоциокультурная концепция. Анализ журналистских текстов / В. В. Богуславская. – Изд. 4-е. – М.: ЛКИ, 2013. – 280 с.
2. Георгиев, Д. Режиссура газеты / Димитр Георгиев. – М.: Мысль, 1979. – 262 с.
3. Добросклонская, Т. Г. Язык средств массовой информации: учеб. пособие / Т. Г. Добросклонская. – М.: КДУ, 2012. – 116 с.
4. Луговая, Ю. А. Теория СМИ и массовой коммуникации / Ю. А. Луговая // Медиаскоп: электронный научный журнал факультета журналистики МГУ. – 2014. – Вып. 4.
5. Самусевіч, В. М. Беларускія СМІ ў лагасферы нацыянальнай культуры / В М. Самусевіч. – Мінск: БДУ, 2012. – 163 с.
6. Чернышова, Т. В. Тексты СМИ в ментально-языковом пространстве современной России / Т. В. Чернышова. – Изд. 3-е. – М.: Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2009. – 296 с.

**Аляксандр Свораб**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## РЭГІЯНАЛЬНЫ ШМАТПАЛОСНІК: ЛОГІКА СУЧАСНАГА АФАРМЛЕННЯ

Перыядычнасць выдання, яго аб’ём, месца выдання – усё гэта ў канчатковым выніку дыктуе структуру штотыднёвіка, а таксамі логіку яго афармлення. Чытачу, які прывык да чатырохпалоснай раённай газеты, пры сустрэчы са штотыднёвікам стала складана арыентавацца ў яго змесце. І тут, асабліва напачатку, да фарміравання ўстойлівай структуры выдання, неабходна дапамагчы чытачу выпрацаваць стэрэатып маршруту па ім.

Невыпадкова найбольшыя змены ў афармленні адчулі на сабе першыя палосы раённых штотыднёвікаў. Для многіх газет характэрнай стала плакатнасць тытульнай старонкі, якая ператварылася ў вокладку са шматлікімі анонсамі, аб’явамі. Заўважальна павысілася роля ілюстравання. Візуальная інфармацыя ўсё больш настойліва пацясняе тэкставую.

У мясцовай газеце сталі часцей з'яўляцца тэматычныя старонкі і развароты. Аб'ёмныя карэспандэнцыі, артыкулы, замалёўкі на ўсю паласу запатрабавалі асаблівага афармлення за кошт дынамічнай кампазіцыі загаловачнага комплексу, інтэнсіўнага ўнутранага афармлення тэксту, прыцягнення дадатковага ілюстрацыйнага матэрыялу (фатаграфій, заставак), іншых графічных акцэнтаў (ініцыялаў, дадатковай фарбы, падложак і інш.).

Часцей стала ўжывацца безлінейная вёрстка, якая сёння ў вялікай модзе. Тым не меней ёю трэба ўмела і асцярожна карыстацца: асабліва дакладна пралічваць міжкалонныя прабелы, выбіраць шрыфтавую гарнітуру і кампанаваць загаловачныя комплексы. У адваротным выпадку парушаецца рытм паласы: яна можа «разваліцца» на асобныя фрагменты. Сумежныя загалоўкі часам чытаюцца як адзін. Перш чым адмовіцца ад лінеек як сродку графічнага афармлення, варта падумаць, чым кампенсаваць іх адсутнасць. Каб утрымаць увагу чытача, безлінейная вёрстка патрабуе дадатковых акцэнтаў. Наўрад ці варта ў такім выпадку звяртацца да насычаных падложак, захапляцца светлым тэкставым шрыфтам на цёмным фоне: гэта зніжае выразнасць тэксту.

Штотыднёвік як тып выдання патрабуе якасна іншага ўзроўню асэнсавання матэрыялу. Яму цяжка аператыўна рэагаваць на новыя падзеі жыцця. Таму выданне вымушана схіляцца да аналітычных жанраў. Логіка шматпалосніка вылучае і новы ўзровень патрабавання да рубрык.

«Круглыя сталы», інтэрв'ю-дыялогі прываблівають не толькі тэлевізійных журналістаў, але і супрацоўнікаў мясцовых друкаваных выданняў. Таму афарміцелі вымушаны шукаць кампазіцыйныя і графічныя сродкі падачы матэрыялаў, якія займаюць цэлую старонку або яе большую частку.

Некалькі тэматычных палос (некаторым тэмам можна аддаць і па дзве старонкі на адным развароце) не толькі забяспечваюць паслядоўнасць газеты ў асвятленні жыцця, але і дапамагаюць сфарміраваць стабільны воблік штотыднёвіка.

Індывідуалізацыя кожнай канкрэтнай паласы павінна дасягацца па-свойму; адна – з дапамогай фармату набору, іншая – абавязковай прысутнасці калажу, трэцяя – з дапамогай каліграфічных шрыфтоў і г. д. Але ўніфікацыя ўсіх элементаў – гэта твар любога выдання, і шматпалосніка таксама.

Аналіз некаторых разваротаў раённых газет прыводзіць да думкі, што шматпалоснік, аб'ём якога патрабуе стабільнай тэматычнай раскладкі па

старонках, пакуль што не змог дабіцца ўстойлівай структуры. І чытачу ў такім разе няпроста шукаць цікавую для яго рубрыку.

Каментарый у шматпалосніку часта выносіцца ў анонс, урэзку, падзагаловак. Загаловак, падзагаловак, рубрыка, урэзка, фотазастаўка або фотаілюстрацыя ствараюць своеасаблівую кампазіцыю, якая вылучае тэкст на паласе, у нумары. Гэта яшчэ адна з афармленчых тэндэнцый загаловачнага комплексу шматпалосніка. З ёй цесна звязана іншая – павышэнне тэкставай культуры, гарманічны выбар загаловачных шрыфтоў, якія добра ўспрымаюцца сучасным чытачом.

На жаль, пакуль што адзіным знакам пазнавальнасці шматпалосніка застаецца дадатковы колер. Выкарыстанне храматычных колераў – ахілесавая пята большасці выданняў мясцовага друку. Часцей за ўсё яму надаецца ўтылітарная роля дэкору. Накоплены іншымі выданнямі вопыт функцыянальнай нагрузкі колеру выкарыстоўваецца слаба.

Многія раённыя газеты ў пошуках афармленчага стылю пераймаюць ужо распрацаваныя кампазіцыйна-графічныя мадэлі рэспубліканскіх штотыднёвікаў. Добра гэта ці дрэнна? На наш погляд, ужыванне вядомых прыёмаў нават неабходна, гэта можа быць першай ступенню для пошуку свайго непаўторнага стылю.

На што яшчэ раз трэба звярнуць ўвагу журналістаў раённых газет? Пры афармленні першай паласы не заўсёды знаходзіцца інфармацыя, якая вартая плакатнай падачы. У такім выпадку прыцягнуць увагу можа якасная фатаграфія, выразны загаловак, цікавыя анонсы. Тэматычныя развароты і палосы неабходна разбіваць не толькі здымкамі, але і невялікімі тэкставымі элементамі – лідамі, цытатамі, каментарыямі, унутранымі загалоўкамі. Канешне ж, такія старонкі павінны афармляцца ў адным стылі, галоўным элементам якіх можа быць якасная фатаграфія. Візуальнымі акцэнтамі на паласе і ў нумары павінна быць добра прадуманая сістэма рубрыкацыі, падача найбольш выразных загалоўкаў, ілюстрацый, пастаяннае месца тэматычных блокаў.

Камп’ютарная тэхналогія выпуску перыядычных выданняў не толькі істотна палегчыла работу, павысіла аператыўнасць друкарскіх працэсаў, але і дала вялікія магчымасці для рэалізацыі самых складаных афармленчых задач.

Мысленне сучаснага чалавека вызначаецца кліпавасцю. З гэтай прычыны трэба даваць чытачу невялікія па памерах тэкставыя элементы. Візуалізацыя валодае высокім патэнцыялам, яна здольная данесці асноўную думку матэрыялу ў самыя кароткія тэрміны. Таму сёння базавым патрабаваннем да дызайну паласы стала максімальнае выка-

рыстанне ёю выразных сродкаў. Падпарадкаванне зместу, адзінства стылю, кантраснасць, прапарцыянальнасць, накіраванасць, эканомнасць, стрыманасць і разумная доля эсперыментатарскага падыходу – усё гэта павышае аўтарытэт газеты, робіць яе прыцягальнай.

**Татьяна Силина-Ясинская**
*Белорусский государственный университет*

## ОПЫТ ИЗУЧЕНИЯ ЖУРНАЛЬНОЙ ПЕРИОДИКИ В ИНСТИТУТЕ ЖУРНАЛИСТИКИ БГУ

Печатная периодика – старейший компонент системы средств массовой информации. Именно на изучении печати изначально строилась вся наука о журналистике. Однако ученые в своем большинстве уделяли внимание в основном исследованию газетной периодики, нежели журнальной. И это оправданно. В разное время количество выходившей журнальной продукции менялось. Например, в конце XIX века, когда в России началось бурное развитие газетного дела, даже встал вопрос, «не исчезнет ли толстый литературный журнал?» [2, с. 5]. В период существования СССР в отечественной системе СМИ долгое время количество журналов было строго ограничено потребностями государства. И только в первое десятилетие суверенитета (с 1991 по 2000 г.), по данным Национальной книжной палаты, количество издаваемых журналов выросло с 56 до 256 [1, с. 142–145]. И продолжает расти до сих пор.

Данная тенденция нашла отражение в учебном процессе Института журналистики Белорусского государственного университета. На факультете журналистики уже более десяти лет преподается учебная дисциплина, посвященная изучению журнального сегмента печатной периодики. Созданная в 2004 году как спецкурс по выбору «Основы работы редакции журнала», данная учебная дисциплина была рассчитана на подробное изучение деятельности журнальных изданий Беларуси и усвоение студентами различий в работе журналистов газетных и журнальных медиа. Основной целью учебной дисциплины стало получение знаний об общих принципах деятельности журнальных СМИ.

В 2008–2009 учебном году учебная дисциплина была возобновлена под названием «Журнальная периодика Республики Беларусь», а с 2015–2016 учебного года стала одной из специальных дисциплин вузовского компонента для студентов, обучающихся по направлению специальности «Журналистика (печатные СМИ)». Определить специфические черты белорусской журнальной продукции и журналистики в контексте